Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 26 (614) Пятніца, 1 кастрычніка 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.

# У АКТЫЎНАСЦІ КАМУНІСТАЎ — ЗАЛОГ ПОСПЕХАЎ

## СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

З кожным годам перад партыйнай арганізацыяй фізічнага факультэта ўзнікаюць усё больш адказныя задачы па падрыхтоўцы і выхаванню высокакваліфікаваных спецыялістаў — фізікаў. Аб тым, як рашаліся гэтыя задачы, ішла размова на справаздачна-выбарным сходзе. Галоўная ўвага была накіравана на вучобу студэнтаў, паляпшэнне работы кафедр, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый, на ліквідацыю парушэнняў вучэбнай і працоўнай дысцыпліны і норм сацыялістычнага быту. Дэканат і партыйнае бюро ўважліва аналізавалі прычыны недахопаў у выхаванні спецыялістаў, вызначалі канкрэтныя шляхі па іх ліквідаванню. У выніку паспяховасць на факультэце павысілася з 89 працэнтаў да 93. Павялічылася колькасць выдатнікаў вучобы з 95 да 112 чалавек. А на «добра» і «выдатна» займаецца 358 чалавек.

Палітыка-выхаваўчая работа праводзілася сумесна з дэканатам, кафедрамі, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыямі. Гэта дало магчымасць значна павысіць паспяховасць па грамадскіх дысцыплінах, прыцягнуць усіх супрацоўнікаў факультэта да актыўнай грамадскай работы. У спартыўных арганізацыях універсітэта прымае ўдзел 329 студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, з іх падрыхтавана 183 першаразраднікі, а ў адзінаццаці відах спорту з дваццаці двух спартсмены-фізікі займаюць першае месца. Семдзесят працэнтаў студэнтаў прымалі актыўны ўдзел у рабоце на цаліне, будоўлях нашай рэспублікі. На працягу ўсяго «працоўнага семестра» яны не мелі ні аднаго спагнання па рабоце.

Аднак побач з поспехамі былі і недахопы. У сваіх выступленнях камуністы Некрашэвіч, Валадзько, Зяцькоў і іншыя ўказалі, што камсамольскія арганізацыі курсаў не праяўлялі сур'ёзнай патрабавальнасці ў барацьбе за паспяховасць, мела месца і праяўленне лібералізму да парушальнікаў дысцыпліны. У асобных групах студэнты цярпіма адносяцца да п'яніц і абібокаў. А пара вызваліць студэнцкую сям'ю ад тых студэнтаў, якія амаль кожную сесію атрымліваюць нездавальняючыя адзнакі. Да іх адносяцца Міскевіч, Антонаў, Запарожац, Жыўко, Кузняцоў, Сазонаў і іншыя.

Партыйнае бюро факультэта ў сваёй рабоце не дабілася такога становішча, каб усе камуністы займалі авангардную ролю ва ўсіх галінах дзейнасці факультэта. Адстаюць у вучобе камуністы Турбан, Кучынскі, Дземянцоў, працягваюць парушаць дысцыпліну камуністы Грыб і Кучынскі.

Ва ўсіх выступленнях камуністаў выказвалася думка, што пад кіраўніцтвам новага складу партыйнага бюро партыйная арганізацыя будзе ў авангардзе ўсіх добрых спраў жыцця фізічнага факультэта.

І. СІНІШЧУК, член партбюро фізфака.

# ЦІ ВІНАВАТЫ АДЗІН САКРАТАР?

*У мінулым нумары нашай газеты быў змешчаны артыкул: «А дзе ж камсамольскі агеньчык?» І вось ужо я на справаздачна-выбарным камсамольскім сходзе хімікаў.*

*Сход сустрэў мяне незвычайнай цішынёй. Але гэта цішыня была зманлівая. Даклад сакратара камсамольскай арганізацыі А. Карабана прысутныя слухалі няўважліва. Кожны з іх займаўся, чым хацеў...*

*Пачаліся спрэчкі. Сход ажывіўся. Дзяўчына, якая сядзела побач са мной, падняла руку і многазначна сказала:*

*— Эх, цяпер пачнецца!..*

*І пачалося.*

*Адзін за другім выходзілі камсамольцы на трыбуну і... і паўтаралі ўсё выказанае А. Карабанам. «Так, камітэт працаваў дрэнна..., не было сувязі з камсамольцамі факультэта, не было выхаваўчай працы, не было..., не было...», А што ж было?*

*Неасведчанаму чалавеку можа паказацца, што ён трапіў на самы адсталы факультэт. А на самай справе ўсё выглядае інакш.*

*Бясспрэчна, камітэт працаваў дрэнна, аднак у камсамольцаў-хімікаў ёсць многа добрых спраў. Студэнты ўдзельнічалі ў цікавым тэлевізійным агеньку, на рэспубліканскую выстаўку было прадстаўлена 23 навуковыя працы, прычым 11 з іх былі адзначаны дыпломамі першай ступені. А ў мінулым годзе студэнты-хімікі далі сваю кроў для выратавання жыцця некалькіх людзей. Хіба гэта ўсё не варта ўвагі. Чаму ж ніводзін студэнт не расказаў аб добрых справах на факультэце?*

*Яшчэ хочацца сказаць аб выступленнях студэнтаў наконт іх паспяховасці. Хваліцца няма чым. З выступлення студэнткі Цырман вырысоўваецца вельмі нецікавая карціна. Аказваецца, што на факультэце 100 чалавек мае 110 правалаў на экзаменах. Студэнты маюць па дзве нездавальняючыя адзнакі. Цырман тлумачыць гэту з'яву вялікай загружанасцю лекцыямі. Гэта не зусім так. Ёсць жа студэнты, якія займаюцца на «добра» і «выдатна». Яны таксама загружаны, як і астатнія. Справа, мабыць, у тым, што камсамольцы недастаткова да сябе патрабавальны, не ўдзельнічаюць у барацьбе факультэта за добрую паспяховасць.*

*Ва ўсіх недахопах у рабоце камітэта камсамола абвінавачвалі сакратара А. Карабана. Ці гэта правільна? Хіба ён адзін здольны правесці камсамольскую работу на ўсім факультэце? Зразумела, не. Мабыць, у многіх недахопах вінаваты самі студэнты.*

*На сходзе быў выбран новы камітэт камсамола. Хочацца думаць, што ён з новымі сіламі і энергіяй возьмецца за камсамольскую работу.*

*М. СКВАРЦОЎ.*

# СЛОВА ПРА СЯБРОЎКУ

Хутка праляцеў першы месяц заняткаў ва універсітэце. А там, глядзіш, і сесія наступіць. Аб гэтым штодзённа памятае Іра Шумко. Таму не марнуе дарэмна часу. Пасля лекцый многа чытае праграмнай і мастацкай літаратуры. Старанна рыхтуецца да семінарскіх заняткаў.

— Семінары — важны этап у паглыбленні ведаў, — гаворыць яна. — Самастойна прыходзіцца займацца вельмі многа.

Вось і цяпер вы бачыце яе на нашым здымку за вучобай. Іры хочацца, як і на першым курсе, быць у ліку лепшых. Яе абавязвае высокае званне студэнта нашага універсітэта. Да таго ж яна член камітэта камсамола факультэта. Прыкладную ў дысцыпліне і вучобе студэнтку камсамольцы і ў гэтым годзе выбралі сваім важаком — ёй даручылі адзін з самых адказных сектараў—акадэмічны. Многа прыходзіцца працаваць. Але адказнае даручэнне зусім не перашкаджае засвойваць вучэбную праграму, вучыцца толькі на «выдатна» і «добра».

В. МЕЛЕЖ.






Ва ўсіх студэнцкіх інтэрнатах нашага універсітэта адбыліся перавыбары студсаветаў. Новым студсаветам і іх важакам дан наказ — не паўтараць памылкі мінулага года, старацца больш увагі звяртаць на студэнцкі быт, клапаціцца аб тым, каб заўсёды працавалі душавыя, пральні, рэгулярна праводзіліся дыспуты, літаратурныя вечары, сустрэчы з пісьменнікамі, героямі працы і іншыя культурна-масавыя мерапрыемствы.

У прафбюро філфака нядаўна разглядалася пытанне аб ліквідацыі студэнтамі акадэмічнай запазычанасці. Прафбюро распрацавала ўмовы на лепшую групу па паспяховасці. Ёй будзе ўручацца пераходны чырвоны вымпел, па меры магчымасці турысцкія пуцёўкі (па выбару) ў Ленінград, Маскву, Кіеў, Брэст. Для лепшага ўліку сіламі прафбюро будзе выпускацца акадэмічны бюлетэнь паспяховасці і наведвання лекцый студэнтамі.

У замежным аддзеле бібліятэкі арганізавана цікавая выстаўка часопісаў Лейпцыгскага універсітэта, які па кнігавыдавецтву займае першае месца. На выстаўцы прадстаўлены дзве серыі часопісаў — прыродазнаўчых і гуманітарных навук.

# ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ!

Пачалася падпіска на выданні газет, часопісаў на замежнай мове. Сёння мы знаёмім нашых чытачоў з умовамі падпіскі.

Газеты выпускаюцца ў двух варыянтах.

**І варыянт—з дадаткам.**

(Назвы і індэксы ўказаны ў адпаведнасці з каталогам Саюздруку).

«Москоу Ньюс» (Московские новости) з дадаткам на англійскай мове. Індэкс 50077.

«Нувель де Моску» (Московские новости) з дадаткам на французскай мове. Індэкс 50087.

«Новедадес де Моску» (Московские новости) з дадаткам на іспанскай мове. Індэкс 50087.

У дадатку друкуюцца поўныя зместы тэкстаў важнейшых дакументаў Савецкага ўрада і прамоў дзяржаўных дзеячоў. Дадатак выходзіць па меры накаплення ўказаных матэрыялаў. Усяго на працягу года выйдзе трыццаць-трыццаць пяць дадаткаў.

У гэтым варыянце газеты няма школьнай, студэнцкай старонкі і старонкі з літаратурнымі творамі зарубежных аўтараў ў арыгінале. Замест іх будуць друкавацца ўрокі рускай мовы для замежных чытачоў і літаратурныя творы савецкіх пісьменнікаў.

**ІІ варыянт — газеты без дадатка**

«Москоу Ньюс» (Московские новости) на англійскай мове. Індэкс 50076.

«Нувель де Моску» (Московские новости) на французскай мове. Індэкс 50086.

«Новедадес де Моску» (Московские новости) на іспанскай мове. Індэкс 50085.

У гэтым варыянце газеты друкуюць школьныя, студэнцкія старонкі, а таксама старонкі з літаратурнымі творамі зарубежных аўтараў у арыгінале.

Падпіска прымаецца: у пунктах падпіскі Саюздруку, аддзяленнях сувязі, пачтамтах, гарадскіх і раённых вузлах сувязі, а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку на прадпрыемствах і навучальных установах.

# Літаратурная старонка

## СЛОВА ПЕРШАКУРСНІКАМ

★ ★

Юрка ГОЛУБ

### Крылатыя прозвішчы

Крылатае бацькава прозвішча —
Найлепшая спадчына сыну.
Я ў калысцы ляжаў яшчэ
І лапатаў крылом галубіным!

Туды дзе грымоты з віскатам
Шлёгаюць злосна па хмарах,
Не ўзняліся дзяды мае высака,
Як Чайка або Гагарын.

Панства шалёна гыркала:
Крылы абрэжам птахам!
Нянавісць людская чыркала
Запалкай пад панскім дахам.

Нянавісць бацькі данеслі
Да муроў Брандэнбургскай
брамы.

Ратаёў, кавалёў і цесляў
Назвалі тады арламі!

Нам далоняў жыццё не песціць.
Па крылах маланкай схвошча.
Абганяюць і час, і песню
Людзі крылатых прозвішчаў.

### Сосны

*На вяршаліне прамень граніцца,*
*Цэлячыся ў зеніт.*
*Бярэ ў штыкіігліца*
*Лабірынт касмічных арбіт.*

*Сядзь, адпачні ад стомы,*
*Сябе краявідам цеш!*
*З зялёнага ракетадрома*
*Стартуюць сосны... у верш!*





### Сена

*Стаім у вадзе па калена.*
*Сушыць спёка ў роце.*
*Мосцім дарогу сенам —*
*Па дышла вазы ў балоце.*

*У коней дрыжаць пахвіны,*
*Запэцканы граззю чорнай.*
*Здаецца, жывёл нявінных*
*Засмокча навекі прорва.*

*Пашчэнкі рве цуглямі страх,*
*Варушыцца багна-здрада.*
*Коней нясём на руках,*
*Быццам вайной з блакады.*

Леанід РАДКЕВІЧ.

## АДКАЗНАЕ ЗАДАННЕ

Падносіў з сябрам да станкоў
Касматыя дошкі,
Падобным быць да сталяроў
Хацелася хоць трошкі.

У простай працы я шукаў
Адказнае заданне.
Яго не толькі майстар даў —
Народ савецкі даў мне.

Калі абед прыйшоў, то сеў
З рабочымі я разам.
І скварку з хлебам усю з'еў
Са смакам першы раз я.

Мазолі мацаў на руках,
Нібыта скарб каштоўны.
Дамоў ужо ў адных радах
З працоўнымі ішоў я.

## ГАРМОНІК

Моладзь нашага пасёлка —
Працавітая.
І да звонкіх песень, танцаў
Прагавітая.
Без мяне не абыйсцся
Ціхім вечарам,

Дробна полькі, вальсы рэжу
Каля рэчкі я.
І шчаслівы быў не раз я
Той здагадкаю,
Што злучыў нямала сэрцаў
Я двухрадкаю.

## ПОЛЕ

Па-над полем жаўрук цвіркоча,
Чуеш, песня звінець не сціхае,
Чуеш, голас пяе дзявочы
Аб прыволлі роднага краю.

Эх ты, поле — шыр залатая!
Я з табою зраслася сэрцам.
Без цябе і пражыць не
змагла б я
Ні імгнення, здаецца, на
свеце!..

Анатоль КАЗЛОВІЧ.

## АСЕННІЯ РАДКІ

Раптам у небе, што шэрым
вісне свінцом,—
гром асенні, глухі,
апошні гром...
Лета бабіна—гэты
бікфордаў шнур—
падпаліў журавінны
з балот агонь,
Жураўы ўзмахам крыл
раздзьмулі яго,
і —
выбух!
Толькі сыплецца лісце
з бяроз...
Так узарванае лета
спаліла сябе,
толькі вецер трывожна
ў шыбы б'е...
Над прыціхлым сялом —
апошні гром.

## Шчасце

Ёсць у гэтым такое шчасце —
Летнім днём на траву ўпасці!
Мазалямі да неба рукі
Параскінуць у стомленых
рухах,

І забыцца так на хвіліну
Пад гарачым, сонечным лівнем...
За плячыма гудзе планета —
Мазалямі яна сагрэта,

Да плячэй яна прыкіпела,
Да ўзмакрэлага, потнага цела...
Ёсць у гэтым такое шчасце—
Да зямлі пасля працы
прыпасці!

Алесь ЖУК.

*Асмужацца ўвосень рабіны*
*І лісцем бяроза адплача,*
*І крык касякоў жураўліных*
*Заблудзіцца ў небе, няйначай.*

*Гарэць будуць толькі ля ганку*
*Рабіны барвовасцю гронак*
*І грэць аж да самага ранку*
*Прастылацьць зялёную зорак.*

Алесь КАМАРОЎСКІ.

## ПІЛЬНА ГЛЯДЗІЦЕ, САЛДАТЫ!

*Маці і дочкі за чаем.*
*Маці глядзіць з адчаем:*
*Дзяўчынкі падкручваюць*
*банцікі.*

*Маці сягоння адзначае*
*Дзень смерці бацькі.*
*Дачушкі не заўважаюць*
*Мамінага гора цень,*
*Перад імі — пачэнне:*
*Яны адзначаюць дзень*
*Свайго нараджэння.*
*А маці баіцца, каб*
*Рыданні спакой не парушылі,*
*Не запынілі смех дачушак...*
*А недзе гарматы напружылі*
*Зрок смертаносных мушак.*
*Антэнай настройце сэрцы,*
*Пільна глядзіце, салдаты,*
*Каб дзён нараджэння і смерці*
*Не супадалі даты!..*



## НАД НЁМАНАМ

Над Нёманам чыстым
Шыпшыннік павіс,
З адвагай турыста
Спускаецца ўніз.

Карэнні над кручай
Ад спекі дымяць,
Вадою жывучай
Палі — зашыпяць.

А трэба — начамі
Начлежнікаў тут
Пабудзіць драчамі
Любімы мой кут.

## У ЛІТАРАТУРНЫМ АБ'ЯДНАННІ «УЗЛЁТ»

Адбылося чарговае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання «Узлёт». Абмяркоўваліся новыя вершы Алеся Камароўскага, Анатоля Казловіча, Леаніда Радкевіча.

Наступнае пасяджэнне літаб'яднання адбудзецца ў сераду 13 кастрычніка.

## НА КОНКУРС ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

**Рэдкалегія газеты «Беларускі універсітэт» аб'яўляе конкурс на лепшы фотарэпартаж, фельетон, нарыс, замалёўку з жыцця нашых студэнтаў. Тэрмін конкурса да першага студзеня 1966 года.**

**Пераможцы будуць адзначаны прэміямі, каштоўнымі падарункамі:**

**І прэмія—фотаапарат;**
**II прэмія—падпісное выданне;**
**III прэмія—розныя пісьмовыя прылады;**

# Чаму не ўдаўся фельетон?

— Вы, значыцца, з газеты.

— Так, Георгій Міхайлавіч, — кажу я каменданту. — Вось прайшло ўжо больш трох тыдняў, як пачаліся заняткі, як Вы тут, у інтэрнаце, наглядаеце за жыццём студэнтаў. І, мне здаецца, вы ўжо, напэўна, прыкмецілі сярод многіх жыльцоў, так сказаць, асабліва выключных—добрых і кепскіх. Дык вось, калі ласка, дайце мне на аловак гэтых людзей, каб пра іх ведалі усе. Можа каго трэба прапясочыць, дык прапясочым. Помніцца, у тым годзе ўжо да гэтага часу такія людзі выявіліся і выявіліся іх «ЧП». Былі і такія, што любілі глушануць гарэліцы, а пасля «пагуляць»: разбіць акенца ці нарабіць апоўначы крыку на ўвесь інтэрнат, нібы яго душыць сто д'яблаў, перавярнуць усё дагары нагамі. Былі і такія, што, не ўмеючы нават падмесці падлогі, умелі да раніцы рэзаць у «дурня». Гэта ўсё тыя, што гаварылі так: «Я — закон, а вымова — гэта не туберкулёз, перанесці можна». Дык вось, Георгій Міхайлавіч, добра было б, каб Вы мне такіх для фельетончыка.

— Не ведаю, ці дапамагу я табе, братка. Справа ў тым, што ў гэтым годзе ў нас няма такіх «ЧП», як у мінулым. Узялі мы кірунак у другі бок. Справы ў нас пайшлі куды лепш. У пакоях студэнты лепш прыбіраюць, і на паверхах, і каля ўваходу дзяжураць нядрэнна. Нават і першакурснікі сёлета, мне здаецца, лепшыя, чым у мінулым годзе. А гэта ж, паверце, некалі было ажно страх. З некаторых дзівіўся, браўся за галаву і думаў: «Няўжо яны з джунгляў прыехалі»? Прышлося разбірацца з некаторымі. Папытайцеся, як ім перцу падсыпалі і на прафкоме і ў студкоме. Людзі адчулі, што не туды папалі. Але ж з імі справа скончана, што было, тое сплыло. — Камендант разгарнуў свой спісак і пачаў зачытваць лепшых жыльцоў інтэрната. — Вось паглядзі, напрыклад, пакой 289. Жывуць: Галаўня Л. Б., Данілкін Р. В., Здановіч В. Л., Ігнаценка В. Д., Кузьмін В. Ф., Красноўскі Л. Г. Не ведаю, як далей будзе, а цяпер, дык хлопцы, адным словам, акуратныя. Па паверху дзяжураць добра і ў пакоі заўсёды чыста. Ды ці мала ў нас такіх студэнтаў? Узяць хоць бы 102-гі пакой ці дзяўчат з 205-га пакою. Многім трэба ў іх павучыцца, як трэба дзяжурыць. З такімі не пагарыш.

— Добра, — кажу я, — а цяпер Вы мне зачытайце людзей з другога полюса. У вас, можа, тут хто дысцыпліну парушае ці яшчэ што?

— А, ведаеш, для газеты нават і няма. Праўда, не заўсёды чыста ў 297 пакоі, але, мне здаецца, хлопцы там выправяцца.

«Ну, — думаю—вось і напішы фельетон на такіх фактах. У адчаі я ўжо хацеў ісці, але Георгій Міхайлавіч мяне затрымаў:

— Пачакай, пачакай, — ён пералістаў свой чорны спісак. А не шкодзіць вось гэтых у газетку, з 72 пакою: Сосіна А. В., Сверыдовіч З. І., Хадасевіч О. К., Гуцава Л. Г., Жыбунь Л. І., Кулеш Т. І. Дзяўчаты, здаецца, нічога, але атрымліваюць двойкі па санітарыі — гэта ўжо нікуды не варта.

— Можа ў вас ёсць на прыкмеце такія, што прасыпаюць лекцыі? — спытаў я.

— Яны то ёсць. Але калі яны спяць, дык да іх цяжка дабрацца. Мала таго, што на ключ пакой замкнуць, дык яшчэ па два ложкі да дзвярэй прысунуць, каб хоць ніхто не парушыў іх спячкі. І ляжаць сабе, толькі дзверы звіняць ад храпу. Але мы і да іх дабярэмся. Сілы хопіць на такіх, калектыў у нас здаровы, моцны.

Нягледзячы на тое, што мая спроба напісаць фельетон на падставах, дадзеных Георгіем Міхайлавічам Рабцэвічам, камендантам інтэрната № 4 не ўдалася, настрой у мяне ад гэтага не сапсаваўся. Добра, каб фельетоны па гэтай толькі прычыне і не ўдаваліся!..

**А. СВОРАБ.**


Рэдактар А. А. ЛОЙКА.

АТ 03465 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. 1057.